Уладзімір КУЛІКОВІЧ

ПРАЕКТ УЛАДЗІМІРА ДУБОЎКІ

Да пытання аб удасканаленні моўнай сістэмы

20-я гг. нашага стагоддзя міжволі суадносіш з легендай. І не толькі таму, што многае здзейсненае ў той час не атрымала яшчэ належнай ацэнкі, што многае акутана яшчэ неверагоднымі таямніцамі, што менавіта у гэты час на карысць Беларусі працавалі Я. Купала, Я. Колас, М. Гарэцкі, Ц. Гартны, К.Крапіва і іншыя дзеячы літаратуры і мастацтва, але і таму, што сённяшнія нашы поступы ў справе беларусізацыі мы звяраем па тых далёкіх ужо дасягненнях.

Асабліва гэта датычыцца практычных праблем беларускага мовазнаўства. Літаральна за першыя дзесяць гадоў дзяржаўнасці Беларусі былі створаны падручнікі і дапаможнікі, слоўнікі па розных галінах навукі на беларускай мове, якая да таго часу не мела трывалай пісьмовай традыцыі. Менавіта найбольш таленавітымі дзеячамі культуры, сярод якіх нам хацелася б вылучыць Уладзіміра Дубоўку, шліфавалася і ўдасканальвалася ўся моўная сістэма.

Але ў тым і складанасць любой моўнай рэформы ў перыяд актыўнага ўдзелу грамадства ў гэтым працэсе, што цяжка, практычна немагчыма прадбачыць яе вынікі. А для маладой беларускай літаратурнай мовы вынікі патрэбны былі неадкладна. І не толькі ў справе нармалізацыі лексікі, але і пры удасканаленні графічнай сістэмы — азбукі, і пры ўпарадкаванні правілаў напісання — арфаграфіі.

Важнай падзеяй у гэтым кірунку дзейнасці стала акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу і азбукі (14 — 21 лістапада 1926 г.), у якой прымаў удзел і У. Дубоўка. Але паколькі рашэнні і рэкамендацыі канферэнцыі не былі абавязковымі, дыскусія адносна ўдасканалення алфавіта і правапісу працягвалася і пасля яе заканчэння.

Фактычна ў гэты час У. Дубоўка напрацоўваў канкрэтны матэрыял для будучай графічнай і арфаграфічнай сістэм беларускай мовы, але працэс станаўлення літаратурнай мовы быў гвалтоўна затарможаны ў 1930 г. А тыя абвінавачанні, што былі прад'яўленыя яму, фактычна прадвырашылі лес многіх цікавых прапаноў і заўваг шчырага прыхільніка моўных рэфармацый.

Больш падрабязна на некаторых з іх мы і спынімся.

Падчас дыскусіі адносна выбару сістэмы знакаў адназначна выказваўся

пісьменнік за кірыліцу, абгрунтоўваў перавагі яе над лацініцай. *«Сучасны беларускі алфавіт,*— адзначаў ён,— *не з`яўляецца цалкам задавальняючым. але трэба адначасна зазначыць, што прыняцце замест яго полъска-чэшскага алфавіту, як гэта мелася на ўвазе некаторымі культурнымі працаўнікамі нашымі, не з`яўляецца мэтазгодным»* . Аднак выйсце з такой сітуацыі, калі графічная сістэма не зусім адпавядае мове, паэт бачыў у стварэнні універсальнага алфавіта, прыстасаванага да беларускіх умоваў. Развіваючы ідэю так званай «антыквы», выкладзенай у невялічкім дапаможніку **«Просты спосаб стацца** ў **кароткім часе граматным»,** надрукаваным у 1918 г., ён сфармуляваў тры важнейшыя прынцыпы, якія пажадана было б улічваць у гэтай рабоце.

1. Адмовіцца ад вялікіх літараў. Наяўнасць іх нічым не апраўдана. *«Меркаванне пра тое, іито вялікія літары існуюцъ для наказания прыпын-каў, — не грунтоўнае. Навошта існуе кропка? — Калі кропка не задавальняе нас у дадзеным выпадку з прычыны свайго малога размеру, можна будзе павялічыць яе, давесці да велічыні скарынінскай кропкі»* [1].

2. Кожнаму гуку павінен адпавядаць асобны знак.

3. Адмовіцца ад сістэмы *«хвосцікаў, кручкоў»*, а ўвесці адпаведныя нашы літары.

Пачаткам у справе стварэння універсальнага алфавіта з`яўляюцца прапановы пісьменніка аб рэфармаванні літар дз, дж, ё; спалучэнняў йі, уо, іе. Падставай для гэтага служаць, на яго думку, цяжкасці пры вывучэнні ў школе, неэканомнасць на паперы. *«Два працэнты ўсяе нашае кніжнае прадукцыі займаюцца лішнімі літарамі з прычыны недасканаласці нашіага алфавіту. А гэта грошы. на лішнюю паперу, кошт набору, ганарар, афармленне»* .

Нсзадавальненне з нагоды ўжывання дзвюх літар для перадачы на пісьме афрыкатаў дз, дж выказвалася яшчэ на канферэнцыі, дзе былі прапановы: Я.Лёсіка — абазначаць іх літарамі д і ж — і П. Растаргуева — абазначаць іх літарамі сербскага алфавіта Ђ і У) . У. Дубоўка, перш чым уводзіць адпаведныя літары, засяроджвае ўвагу на пэўных «вымогах», якімі павінны кіравацца навукоўцы ў сваім выбары. Новыя знакі, згодна з яго меркаваннямі, павінны: гарманаваць з рэштаю літар нашага алфавіта; быць лёгкімі і эканомнымі (у часе) для друку і пісьма; не абавязкова выходзіць з аднаго якога-небудзь алфавіта. І выпрацаваны на падставе дэталёвага аналізу адпаведных літар асноўных алфавітаў праект У. Дубоўкі для дз і дж меў наступны выгляд:

	друкаваныя		рукапісныя	
	вялікія	малыя	вялікія	малыя
Дз	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Дж	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]

Беларускія чытачы мелі магчымасць азнаёміцца з гэтымі літарамі ў кантэксце. Часопіс «Узвышша» з № 5 за 1928 г. пачаў друкаваць з імі асобныя матэрыялы, а з № 2 за 1929 г., згодна з пастановай агульнага сходу ад 14 лютага 1929 г., ужо ўвесь часопіс друкаваўся з новымі літарамі. Праўда, больш ніякае выданне не падтрымала ініцыятыву ўзвышэнцаў, а з крытыкай графічнага выканання літар для гэтых гукаў выступіў прафесар П. Бузук ''.

Не атрымалі далейшага заканадаўчага афармлення і прапановы пісьменніка замяніць створанае Карамзіным ё на о *(он, лон, Лондон)* ; увесці па прыкладзе ўкраінцаў літару і для перадачы спалучэнняў йі *(`ікаўка, `ім., па`іла)* `. Усе яны лічыліся неістотнымі, малазначнымі. Больш таго, падобныя прапановы У.Дубоўкі зблізіць універсальны беларускі алфавіт з узорамі графічнай сістэмы ў еўрапейскіх народаў расцэньваліся як імкненне аб'яднаць пралетарскую культуру з буржуазией.

Што датычыцца правапісу, то ў гэтым пытанні пісьменнік паслядоўна і заўзята адстойваў такі пункт гледжання, згодна з якім любыя арфаграфічныя змены павінны спрашчаць існуючы правапіс і не павінны ўплываць на прыродную мілагучнасць беларускай мовы. Гэта, на яго думку, і адпраўны пункт, і мэта, дзеля якой павінна праводзіцца рэформа. Так, станоўча ацэньваючы граматыку Б. Тарашкевіча і Я. Лёсіка па ўнармаванні напісання падоўжаных зычных і дзвюх зычных цераз мяккі знак, ён падкрэслівае: *«Самым цяжкім з`яўляецца ўтлумачыць селяніну тое, чаму фактычна адзін гук перадаецца аж цераз пяць літар* ***(судзъдзя)».*** І далей прапануе замяніць такое шматлітарнае напісанне падоўжаных адналітарным са знакам падаўжэння над літарай. *«Праект мой грунтуецца не толькі на агулънапашыраным у міжнароднай практыцы спосабе напісання падоўжаных гукаў, але і на старой беларускай традыцыі, якая выпрацоўвалася на працягу стагоддзяў»* ``.

Гэта заўвага нам бачыцца слушнай. Яна прадугледжвае не толькі захаванне мілагучнасці, але і спрашчэнне адлюстравання гэтай прыроднай уласцівасці мовы на пісьме, што часткова прадаўжала б традыцыі старабеларускай мовы, заахвочвала б да яе даследавання, пошукаў новых цікавых асаблівасцяў, а магчыма, паспрыяла б унікнуць многіх спрэчных пытанняў, якія канчаткова не вырашаны і сёння '''.

Пры назіранні над мовай народнай паэзіі, рытмам, рыфмай У. Дубоўка адзін з першых засведчыў той факт, што пры дапамозе сродкаў арфаграфіі можна і неабходна захоўваць спецыфічныя асаблівасці роднай мовы. Менавіта мэце *«ўхілення нямілагучных гуказлучэнняў»* былі падпарадкаваны прапановы пісьменніка размежаваць напісанне канчаткаў прыметнікаў жаночага роду адзіночнага ліку ў родным склоне, а таксама назоўнікаў і прыметнікаў у

творным склоне; упарадкаваць напісанне у на пачатку слова; прыстаўных галосных і зычных; скарыстоўваць «сутоку» (аферэзіс) ".

Клопатам пра захаванне нацыя нальнага аблічча мовы прасякнуты і меркаванні паэта наконт напісання прозвішчаў, ужывання «працятых» формаў *трэ' (трэба), на'т (наваг). «У народнай мове,*— адзначае ён,— *ста-іць так: для замужніх, для маладзіц — Станкевічыха, для дзяўчат — **Станкевічанка*** [...] *у народнай мове чуем — **у Сымонавага сына, каля Грыгоравай хаты».*** Таму тут жа прапануе для вызначэння прыналежнасці пісаць: *вершы Кальцовага, Нікіціна-га, Івановага* ```. Формы ж *трэ'* і *на'т,* лічыць ён, мэтазгодна ўжываць тады, калі наступнае слова пачынаецца апошнім складам папярэдняга *{трэ'~ было, на'т воды няма)*``.

Сёння, калі мы імкнемся зберагчы нацыянальнае аблічча нашай мовы, па-навуковаму прафесійна перагледзець некаторыя спрэчныя пытанні правапісу, то у першую чаргу павінны, каб не паўтарыць памылак мінулага, уважліва прыгледзецца, асэнсаваць індывідуальныя праекты ўдасканалення моўнай сістэмы. Адзін з іх, праект У. Дубоўкі, на нашу думку, заслугоўвае належнай увагі.

Дубоўка У. Лацінка ці кірыліца: Да праекту рэформы беларускага альфабэту // Узвышша. 1929. № 1.— С. 111. Тамтама. — С. 112.

Дубоўка У. Падоўжаныя (або падвойныя) зычныя і спосаб іх азначэння на пісьме Узвышша. 1929. № 2.— С. 80.

Гл.: Працы акадэмічнае канфсрэнцыіі па рэформе беларускага правапісу і азбукі.— Мн., 1927.

' Дубоўка У. Праект літар для згукаў «дз» і «дж» // Узвышша. 1928. № 4.— С. 170. ` Гл.: Бузук П. «Культура мовы» ў «Узвышшы» /7 Маладняк. 1929. .№ 5 — 6.— С. 114 — 116.

г Узвышша. 1929. № 1.— С. 111.

` Дубоўка У. Некаторыя прыватныя выпадкі мілагучнасці нашае мовы Узвышша. 1927. № 4.— С. 91.

" Узвышша. 1929. .№ 2.— С. 79 — 81.

Лукашанец А. Праблемы беларускага правапісу: Нататкі з акадэмічнай канфсрэнцыі // Роднае слова. 1993. № 2.— С. 3 — 7.

` Куліковіч У. Мілагучнасцю сэрца чаруе /,' Наша слова. № 49. С. 5.

'-' Узвышша. 1927. № 4. — С. 93. м Узвышша. 1927. № 2.— С. 180 -181. [1] Узвышша. 1927. .№ 4.— С. 92.